УДК [930.25:316.653:303.621.32](476)“20”

*Вольга ІВАНОВА*

# АРХІЎ КАЛЕКТЫЎНАЙ ПАМЯЦІ: збіранне, захоўванне і выкарыстанне

У 2011 годзе ў Беларусі быў створаны унікальны праект Беларускі архіў вуснай гісторыі – онлайн сховішча вусных успамінаў, дaступнае карыстальніку ў любой кропцы света. У артыкуле раскрываюцца асаблівасці структуры і дзейнасці дадзенага праекта, зважаючы на спецыфіку стварэння вуснага успаміна як гістарычнай крыніцы метадам біяграфічнага інтэрв’ю. Даецца характарыстыка асноўных даследчыцкіх накірункаў такіх як “1939 год у памяці беларусаў”, “Пасляваенны голад”, “Чарнобыльская катастрофа”, “Калектывізацыя ў Заходняй Беларусі” і інш.

*Ключавыя словы:* вусная гісторыя, архівы вуснай гісторыі, вусныя успаміны, інтэрв’ю, калектыўная памяць, методыкі даследавання вуснагістарычных крыніц.

Архівы вуснай гісторыі з’яўляюцца адным з відаў архіваў, якія пачалі ствараццаў сярэдзіне мінулага стагоддзя ў ЗША. Грунтоўная распрацоўка тэорыі вусных архіваў прыпала на канец 70-х – пачатак 90-х гг. – перыяд актыўнага станаўлення метада вуснай гісторыі[1]. У постсавецкіх краінах ідэя стварэння сховішчаў вусных успамінаў стала актуальнай ад пачатку гадоў 90-х, калі адбываўся актыўны пошук новых крыніц для гістарычных даследаванняў. Сама ідэя архіваў вуснай гісторыі ў архівазнаўстве шчыльна звязана з антрапалагізацыяй гэтай дысцыпліны і яе гісторыі як навукі ў цэлым. Яна палягае на канцэпце аб тым, што кожны чалавек мае права захаваць памяць аб сабе для нашчадкаў. Пры ўвасабленні гэтай ідэі задачай архівістаў становіцца захоўванне дакументаў, якія расказваюць пра жыццё простага чалавека[2].

У Беларусі пік цікавасці да збору і выкарыстання вуснагістарычных крыніц прыпаў на канец 1980–1990-я гг.,калі вельмі актуальнай была тэма савецкіх рэпрэсій, жыцця рэлігійных супольнасцей і іншыя сюжэты, якія не былі адлюстраваныя ў традыцыяйных архіўных дакументах, ці гэтыя дакументы па-ранейшаму заставаліся недаступнымі. Збор інтэрв’ю праводзіўся рознымі грамадскімі і навуковымі арганізацыямі, а таксама прыватнымі асобамі (гісторыкамі, краязнаўцамі, мовазнаўцамі, журналістамі і інш.). Гэтыя даследванні насілі ў большай ступені папулярны, чым навуковы характар, а методыка правядзення інтэрв’ю не была распрацаваная і абмяжоўвалася па-большасці асобнымі тэматычнымі сюжэтамі[3].

---

[1] *Бутько В. Н.* Устная история и архивы: американский опыт // Беларускі археаграфічны штогоднік.– Минск, 2012. – Вып. 13. – С. 248–259.

[2] *Іванова В.* Кірункі антрапалагізавання архівазнаўства: беларускі досвед і перспектывы / В. Іванова // Archiwa–Kancelarie–Zbiory. – Toruń, 2012. – № 3(5). – С. 95–109.

[3] *Smaliančuk A.* Oral Historyin Belarus. Stand und Entwick lungs perspektiven / A. Smaliančuk,

Тым не менш, з цягам часу быў назапашаны вялікі і каштоўны комплекс дакументаў, які патрабаваў пэўных захадаў да забеспячэння іх захоўвання. У 2011 г. беларускім гісторыкам Ірынай Кашталян была агучаная думка аб небходнасці стварэння адпаведнага онлайн сховішча. Гэтая ідэя была падтрыманая прафесарам Алесем Смаленчуком, які напрацягу даволі працяглага часу працаваў у галіне вуснай гісторыі, а таксама архівазнаўцам Вольгай Івановай і сябрамі моладзевага грамадскага аб'яднання "Гісторыка". У 2011–2012 гг. праводзілася праца па праектаванню архіва, вызначэнні асноўных метадалагічных падыходаў да збору, захоўвання і апрацоўкі інтэрв'ю, а таксама забеспячэння доступу і найбольш шырокіх магчымасцяў выкарыстання. Так паўстаў Беларускі архіў вуснай гісторыі (БАВГ) – онлайн сховішча на партале nashapamiac.org.

Яго камплектаванне адбывалася па двух асноўных накірунках – прыём калекцый ад уладальнікаў і запіс успамінаў камандай архіва падчас экспедыцый ці асобных выездаў. Ад гісторыкаў, краязнаўцаў, этнографаў, журналістаў было ўзята на захоўванне больш 20 калекцый. Гэта калекцыі гісторыка Алеся Смаленчука (2002–2011 гг.), этнографаў Сафронія Жлобы, Ірыны Чарнякевіч, Вольгі Лабачэўскай (з канца 1990-х гг.), гісторыкаў Ніны Стужынскай (канец 1990-х гг.), Наталлі Гардзіенка (2003–2005), Ірыны Раманавай (2003–2004), Уладзіміра Валодзіна (2007), Ірыны Кашталян (2008–2009) і інш. Тэматыка вусных успамінаў вельмі шырокая. Гэта гісторыя сталінскіх рэпрэсій, штодзённасці, беларускай эміграцыі, "остарбайтараў", гісторыя асобных беларускіх гарадоў і мястэчак, этнаграфічныя запісы і нават гісторыя мінскіх "хіпі". Успаміны, што запісваліся ад пачатку 1990-х гг., пераважна былі на магнітнай стужцы і патрабавалі пераводу ў лічбавы фармат. Самым раннім дакументам архіва сталі алічбаваныя ўспаміны вядомага беларускага этнографа, грамадскага дзеяча і публіцыста Мар'яна Пецюкевіча, запісаныя ў Рыме ў 1972 г.

Пачынаючы з 2011 г. камандай архіва штогод праводзяцца экспедыцыі па той ці іншай тэме. За шэсць гадоў было праведзена каля 15 экспедыцый і сабрана больш 800 успамінаў з розных рэгіёнаў Беларусі. Усяго ў архіве на канец 2017 г. захоўвалася 1250 успамінаў, больш 6 тысяч дакументаў, агульным аб'емам каля 4 Тб. Акрамя аўдыё і відэазапісу ўспаміна робяцца таксама фотаздымкі рэспандэнта, інтэр'ера хаты, копіі дакументаў і фотаздымкаў сямейнага архіва. Усё гэта стварае магчымасць для інфармацыйнага кантэкста пры інтэрпрэтацыі інтэрв'ю.

Успаміны запісваюцца на падставе адмысловага апытальніка. Гэта, як правіла, біяграфічныя інтэрв'ю з асобнымі тэматычнымі блокамі[4]. Яны складаюцца з некалькіх фазаў: анкетнай часткі, часткі т.зв. "нязмушанага аповеду", у якім рэспандэнт самастойна распавядае пра сваё жыццё без пытанняў інтэрв'юера, часткі калі задаюцца пытанні па біяграфіі ці тэме праекта і заключная фаза падсумавання і рэфлексій, калі рэспандэнт дае ацэнку свайго жыцця, яго найбольш цяжкіх і шчаслівых момантаў. Падчас інтэрв'ю ствараюцца суправаджальныя дакументы, ў якіх пазначаюцца

V. Ivanova, T. Kasataja // BIOS. Zeitschriftfür Biographie forschung, Oral History und Lebensve rlaufs analysen. Inhalt Heft 1 und 2. Jahrgang, 2014. – № 27. – S. 258–293; *Грінченко Г.* Усна історія в пострадянських дослідницьких практиках [Електронний ресурс] / Г. Грінченко, І. Реброва, І. Романова. – Режим доступу: http://uamoderna.com/md/grinchenko-rebrova-romanova-oh

[4] *Махоўская І.* Біяграфічны наратыў як гістарычная крыніца: да пытання магчымасцяў і перспектыў выкарыстання // Восень 1939 года ў гістарычнай традыцыі і вуснай гісторыі / [пад рэд. д-ра гіст. н. А. Смаленчука]. – Мінск, 2015. – С. 216–233.

анкетныя дадзеныя рэспандэнта, асаблівасці правядзення інтэрв'ю, стану рэспандэнта, унутранай структуры аповеду. Занатоўваюцца асноўныя тэмы змушанага і нязмушанага аповеду, апісваюцца фотаздымкі асабістага архіва.

Згодна беларускаму заканадаўству аўтарскія правы на інтэрв'ю належаць рэспандэнту. Таму пасля запісу з ім падпісваецца дамова, згодна якой архіву перадаецца права на выкарыстанне ўспамінаў у навуковых, папулярызацыйных ці асветніцкіх мэтах. У нешматлікіх выпадках калі рэспандэнт адмаўляецца ад падпісання дамовы, інтэрв'ю выкарыстоўваецца на ўмовах ананімнасці (імя і першая літара прозвішча).

Пасля запісу інтэрв'ю адбываецца яго рэгістрацыя ў базе дадзеных, дзе яно атрымоўвае ўнікальны шыфр, а таксама апісанне, якое дае карыстальніку магчымасць папярэдняга знаёмства з біяграфіяй сведкі, зместам і асаблівасцямі інтэрв'ю. Само інтэрв'ю ніякім чынам не рэдагуецца, захоўвецца толькі арыгінальны запіс, які адлюстроўвае ўсе яго асаблівасці і тэхнічныя моманты. Усе дакументы захоўваюцца ў трох копіях: на серверы (цёмная копія, якая не выкарыстоўваецца), на цвёрдым дыску (працоўная копія) і на партале (карыстальніцкая версія паменшанага памеру).

Інтэрв'ю змешчаныя ў архіў могуць таксама транскрыбавацца. Гэта значыць, што ствараецца даслоўная тэкставая версія запісу, якая цалкам адлюстроўвае асаблівасці размоўнай мовы рэспандэнта. Пры транскрыбацыі інтэрв'ю разбіваецца на пахвілінныя сегменты, для забеспячэння магчымасцяў пошуку і стварэння тэматычных, імянных, геаграфічных і храналагічных паказальнікаў. Транскрыбаваная чацвёртая частка ўспамінаў архіва.

Зыходзячы з асаблівасцяў інфармацыі і яе рэпрэзентацыі на партале, пошук можа адбывацца па асобах, месцах, тэмах, якія згадваюцца ў агульных апісаннях калекцый і дакументаў, ёсць таксама паўнатэкставы пошук і пошук па індэксах для транскрыбаваных дакументаў. Прагляд відэа і аўдыё ажыццяўляецца пасля рэгістрацыі карыстальніка і яго знаёмства з правіламі выкарыстання дакументаў. Тэкставыя версіі інтэрв'ю і суправаджальных дакументаў даступныя таксама для пампавання.

Карыстальнік нясе адказнасць за выкарыстанне вусных успамінаў: фактаў з асабістага жыцця і выказванняў рэспандэнтаў ці інтэрв'юераў, якія наносяць шкоду гонару і годнасці рэспандэнта, спрыяюць распаўсюджанню міжасабовай, палітычнай, нацыянальнай ці рэлігійнай розні, а таксама задакладнасць інфармацыі, прыведзенайу дакументах архіва. Пры выкарыстанні дакументаў БАВГ абавязковай з'яўляецца і спасылка на дадзенае сховішча.

Даследчыкамі з БАВГ напрацягу шасці гадоў быў рэалізаваны цэлы шэраг тэматычных праектаў, прысвечаных вывучэнню асобных сюжэтаў гісторыі Беларусі, заснаваных на вусных успамінах. Адным з першых стаў праект "1939 год у памяці беларусаў" (навуковы кіраўнік – А. Смалянчук). У 2012, 2013, 2014 гадах БАВГ праводзіліся экспедыцыі ўздоўж былога савецка-польскага памежжа, ўключаючы тры рэгіёны Беларусі: поўдзень – Палессе (Жыткавіцкі р-н Гомельскай вобл., Лунінецкі і Столінскі р-ны Брэсцкай вобл.), цэнтральную частку – Міншчыну (пераважна Стаўбцоўскі р-н), і поўнач – Віцебшчыну (Глыбоцкі і Полацкі р-ны). Усяго было сабрана больш 220 успамінаў, агульнай працяглсацю каля 250 гадзін. Іх асэнсаванне адбывалася праз стварэнне рубрыкі[5], падчас канферэнцыі "Верасень 1939 года ў гістарычнай традыцыі і

[5] Беларускі архіў вуснай гісторыі. 1939 г. у вусных успамінах жыхароў Беларусі [Електронний ресурс]. – Режим доступу: http://nashapamiac.org/archive/getrubrics.html?rubricId=2.

вуснай гісторыі"[6], а таксама публікацыі артыкулаў. Даследавалася штодзённасць жыцця памежжа, вобразы савецкай і польскай палітыкі па абодва бакі мяжы, успрыняцце жыхарамі заходняй і усходняй частак пачатку Другой сусветнай вайны, трансфармацый "за Першымі Саветамі", вобразаў і ментальных асаблівасцяў "заходнікаў" і "усходнікаў". Біяграфічныя інтэрв'ю калекцый транскрыбаваныя і раскрываюць цэлы спектр іншых сюжэтаў гісторыі Беларусі XX ст.,як напрыклад, тэму савецкіх рэпрэсій на памежжы, падзеі Другой сусветнай вайны, раскулачванне і інш.

Экспедыцыі праводзіліся і на тэрыторыі 5 раёнаў Гомельскай вобласці ў 2013 і 2014 гг. з мэтай даследавання тэмы пасляваеннага голаду (навуковы кіраўнік – І. Кашталян). Усяго было запісана больш 150 інтэрв'ю. Вопыт голаду для рэспандэнтаў быў траўматычным, успаміны пра яго звязаны з эмацыйнымі праявамі, асабліва калі гэта датычыла блізкіх членаў сям'і. Сведкі нярэдка параўноўвалі голад 1932–33 і 1946–47 гг. Першы быў асабліва страшным – ад яго ў некаторых населеных пунктах па вусных сведчаннях памерла да паловы складу насельніцтва. Акрамя тэмы голаду ва ўспамінах гучаць сюжэты праасаблівасці даваеннай, ваеннай і паваеннай штодзённасці, Чарнобыльскую катастрофу і савецкія рэпрэсіі.

У 2015 годзе быў распачаты адмысловы праект прысвечаны вывучэнню памяці жыхароў Беларусі аб наступствах Чарнобыльскай катастрофы. Усяго было сабрана 45 інтэрв'ю асобаў 1936–1986 г.н. Гэта успаміны ліквідатараў, перасяленцаў, мясцовых жыхароў, а таксама людзей, якіх трагедыя не закранула непасрэдна. Інтэрв'ю праводзіліся ў гарадах кампактнага пражывання перасяленцаў (Мінск, Белаазёрск), і ліквідатараў (Рэчыца, Мазыр). Асабліва цікавым быў выездў Чарнобыльскую зону і сустрэча з нешматлікімі жыхарамі напаўадселенай вёскі Савічы, Брагінскага р-на. Памяць пра падзеі кожнай з гэтых груп мае свае асаблівасці: у ліквідатараў дамінуе сюжэт аб подзвігу, у перасяленцаў – страча на гараю, мясцовыя жыхары спадзяюцца на адраджэнне жыцця вёскі пасля катастрофы.

У 2015, 2016 і 2017 г. Беларускі архіў вуснай гісторыі праводзіў экспедыцыі, асноўнай мэтай якіх было даследаванне пасляваеннай калектывізацыі ў Заходняй Беларусі праз успаміны сведкаў падзей (кіраўнік – А. Смалянчук). Збор ўспамінаў адбываўся ў розных рэгіёнах Беларусі, што маюць адметнасці ў нацыянальным і рэлігійным складзе насельніцтва: на Піншчыне, Лідчыне і Воранаўшчыне, а таксама Маладзечаншчыне і Вілейшчыне. Усяго было сабрана 180 успамінаў агульнай працягласцю каля 300 гадзін. Стварэнне калгасаў паўстае ва ўспамінах як гвалтоўная форма сацыяльных трансфармацый заходнебеларускай вёскі ў канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. Але супраціў зменам не набыў грамадска значных формаў, што было абумоўлена цяжкім матэрыяльным і маральным становішчам пасля вайны, жорсткай палітыкай уладаў і ментальнымі асаблівасцямі шэраговага жыхара беларускай вёскі, схільнага да пакоры перад сілай і ўладай. Найбольш траўматычным было раскулачванне, хаця і яно ў значнай колькасці выпадкаў успрымаецца з пэўнай доляй іроніі.

У 2013 і 2017 гг. адмысловую распрацоўку атрымала тэма прымусовай працы падчас Другой сусветнай вайны (навуковы кіраўнік – А. Белановіч-Петц)[7]. Было сабрана каля 100 інтэрв'ю, што ўтрымлівалі аповеды пра вывазы і жыццё ў

---

6 Восень 1939 года ў гістарычнай традыцыі і вуснай гісторыі… – Мінск, 2015. – 288 с.

7 Парламент памяці: гісторыі беларускіх "остарбайтараў" / [аўт.-уклад. А. Белановіч, Г. Верамейчык]. – Мінск, 2011. – С. 79.

Германіі. Рэспандэнты рабілі параўнанні працы ў калгасах пасля вайны і ў Германіі на прымусовых працах. Першая на думку рэспандэнтаў была на шмат цяжэйшай. Закраналіся тэмы адносінаў нямецкага насельніцтва да “остарбайтараў”, асаблівасці мужчынскай, жаночай і дзіцячай працы, жаночага лёса падчас прымусовай побыту ў Германіі, нараджэння дзяцей, стварэння сям’і, лёсу пасля вяртання (магчымасцяў вучобы, кар’ернага росту) і інш.

Гэта далёка не поўны пералік тэмаў, якія распрацоўваюцца даследчыкамі БАВГ. Да іх можна аднесці таксама тэму гісторыі Мінскага гета і Халакосту падчас Другой сусветнай вайны, якая распрацоўваецца разам з Гістарычнай майстэрняй імя Л. Левіна (http://gwminsk.com), гісторыя савецкіх рэпрэсій – разам з Віртуальным музеем савецкіх рэпрэсій (http://represii.net/ru) і інш.

Беларускім архівам вуснай гісторыі рэгулярна праводзяцца “круглыя сталы” і семінары з удзелам беларускіх і замежных спецыялістаў у галіне вуснай гісторыі. Так, напрыклад, госцем БАВГ у 2013 г. была Імке Хансэн з Інстытуту сучаснай гісторыі (Берлін), у 2015 г. – прафесар Аляксандр фон Плата з Завочнага універсітэту г. Хагена. Архіў супрацоўнічае з беларускімі і замежнымі інстытуцыямі, якія спецыялізуюцца ў галіне вуснай гісторыі. У прыватнасці, гэта грамадскае аб’яднанне “Дыярыуш” (Беларусь), цэнтр “KARTA” (Польшча), online-archiv “Zwangsarbeit 1939–1945” (Германія) ды інш.

БАГВ прадстаўляе сабой не толькі сховішча вусных крыніцаў і супольнасць даследчыкаў у галіне вуснай гісторыі, але і асветніцка-адукацыйную пляцоўку. Дзеля папулярызацыі метаду вуснай гісторыі праводзяцца трэнінгі для настаўнікаў, журналістаў і ўсіх зацікаўленых гэтай дысцыплінай.

Аднымі з важнейшых папулярызатарскіх мерапрыемстваў праекта сталі конкурс для школьнікаў “1939 год у памяці беларусаў” і студэнтаў “Чарнобыльская катастрофа і яе наступствы ў памяці жыхароў Беларусі”, у межах якіх распрацоўваліся метадычныя дапаможнікі па збору і апрацоўцы інтэрв’ю, рыхтаваліся метадычныя парады для настаўнікаў і выкладчыкаў па выкладанні гэтых тэмаўунавучальных установах Беларусі.

Этапным момантам у дзейнасці БАВГ стала правядзенне ў верасні 2014 г. у Мінску першай навуковай Міжнароднай канферэнцыі “Верасень 1939 года у гістарычнай традыцыі і вуснай гісторыі”. Тут апроч канкрэтна-гістарычнай тэматыкі, датычнай не толькі падзеяў восені 1939 г., але таксама іншых важных і недаследаваных праблем айчыннай гісторыі XX ст., таксама ўздымаліся актуальныя пытанні развіцця вуснай гісторыі ў Беларусі. Праграма канферэнцыі ўключала як рэфераты, падрыхтаваныя на архіўных матэрыялах, так і заснаваныя на вуснагістарычных крыніцах. У прыватнасці, выкарыстанне апошніх дазволіла А. Смаленчуку зрабіць выснову пра тое, што падзеі восені 1939 г., якія паспрыялі аб’яднанню беларускіх земляў у межах БССР, але адначасна сталі пачаткам Другой сусветнай вайны, у памяці сучасных беларусаў існуюць як два супрацьлеглыя месцы памяці. Адно застаецца сімвалам перамогі беларусаў, якой паспрыяла палітыка сталінскага СССР, а другое сімвалам трагедыі, напамінам пра пачатак вайны.

Важнай часткай канферэнцыі стала дыскусія “Вусная гісторыя ў Беларусі: перспектывы міждысцыплінарнага ўзаемадзеяння”[8]. Асноўнымі дыскутантамі былі навукоўцы, якія прадстаўлялі гістарычную навуку (Аляксандр Смалянчук і Ірына

[8] Дыскусія “Вусная гісторыя ў Беларусі: перспектывы міждысцыплінарнага ўзаемадзення” (мадэратар Т. Вадалажская) // Восень 1939 г. у гістарычнай традыцыі...: – С. 264–280.

Кашталян), сацыялогію (Таццяна Вадалажская і Аляксей Ластоўскі), архівазнаўства (Вольга Іванова) і антрапалогію (Ірына Махоўская). Упершыню ў Беларусі адбылося публічнае абмеркаванне стану і перспектываў вуснай гісторыі як пляцоўкі міждысцыплінарных даследаванняў.

Дыскутанты канстатавалі, што ў Беларусі сфарміраваліся два асноўныя падыходы да вуснай гісторыі. Першы – гэта імкненне да рэканструкцыя (або канструявання) мінулага на аснове вусных ўспамінаў непасрэдных сведкаў гістарычнай падзеі. Гэтая задача застаецца актуальнай як па прычыне абмежаванасці дакументальных гістарычных крыніц традыцыйнага тыпу, так і ў сувязі з патрабаваннямі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі. Для другога падыходу, які ўсё больш выразна прысутнічае ў Беларусі, характэрны погляд на вусную гісторыю як на інструмент вывучэння сацыяльнай памяці, а таксама ідэнтычнасцяў (нацыянальных, сацыяльных, гістарычных, гендэрных ды інш.). Пры гэтым увага даследчыка факусіруецца на тым, што і як распавядае рэспандэнт, як ацэньвае падзеі, які сэнс ім надае.

Яшчэ адна канферэнцыя была прысвечана тэме вельмі значнай не толькі для беларускага, але і для ўкраінскага грамадства “Чарнобыльская аварыя і грамадства: 30 год пасля катастрофы”. Яна адбылася ў красавіку 2016 г. і сабрала гісторыкаў, культуролагаў, сацыёлагаў, літаратуразнаўцаў і прадстаўнікоў іншых гуманітарных навук з Беларусі, ЗША, Японіі, Ураіны, Польшчы, Германіі, Канады. Удзельнікі канферэнцыі шукалі адказы на пытанні: якія сацыяльныя і палітычныя наступствы мела катастрофа на Чарнобыльскай АЭС для грамадства Беларусі і постсавецкага рэгіёну? Як яна паўплывала на развіццё сацыяльных і гуманітарных навук? Як Чарнобыльская катастрофа і яе наступствы адлюстраваліся ў памяці і культуры народаў Беларусі, Украіны, Расіі? Праца даследчыкаў над гэтай тэмай непазбежна сутыкаецца з праблемай калектыўнай траўмы, асаблівасці працы з якой былі раскрытыя ў выступе Аляксандра фон Плата, Томаса Бона і інш. выступоўцаў. Па выніках канферэнцыі быў выдадзены зборнік матэрыялаў[9].

Апошняя значная падзея, арганізаваная БАВГ пры падтрымцы Польскага Інстытута ў Мінску, Лятучага Універсітэта, Інстытута славістыкі Польскай акадэміі навук, гэта канферэнцыя “Масавыя рэпрэсіі ў СССР у гістарычных даследаваннях і калектыўнай памяці”, якая адбылася у сярэдзіне лістапада 2017 г. Яна стала першай канферэнцыяй па дадзенай тэматыцы ў Беларусі за апошнія 20 гадоў і сабрала ўдзельнікаў пераважна з Беларусі, Украіны, Расіі і Польшчы. Тут абмяркоўваліся пытанні паняцця і маштабаў рэпрэсій, чалавечага вымярэння трагедыі, палітыкі памяці ў дачыненні да тэмы рэпрэсій у розных краінах, грамадскага ўзаемадзеяння ў гэтым накірунку.

Такім чынам, за даволі непрацяглы час свайго існавання Беларускі архіў вуснай гісторыі стаў не толькі дастаткова грунтоўным сховішчам вусных успамінаў па гісторыі ХХ ст., але і пэўнай пляцоўкай для вывучэння і абмеркавання найбольш актуальных падзей развіцця Беларусі ў мінулым стагоддзі. Тут няма абмежавання праблематыкі, галоўным з’яўляецца метад вуснай гісторыі, які дае магчымасці міждысцыплінарнага аб’яднання высілкаў навукоўцаў па даследаванні пэўнай тэмы, а таксама пошуку тэарытычных рамак для аналіза вуснагістарычных крыніц.

[9] Чарнобыльская аварыя і грамадства: 30 год пасля катастрофы / [пад рэд. А. Ф. Смаленчука]. – Мінск, 2017. – 384 с.

**Volga Ivanova. Belarusian State University Archive of collective memory: collection, storage, use**

In the year 2011a unique project of the Belarusian OralHistoryArchive has been created. It was the online store of theoral memories available to the user anywhere in the world. The article describes the structure and activities of the project, taking into account the specifics of creating oral memoirs as a historical source by the way of the biographical interviews. It describes the main areas of the BOHA research such as the “The year 1939 in Memory of the Belarusians”, “The Post-war Hunger”, “The Chernobyl Disaster”, ‘The Collectivisation in the West Belarus” and etc.

*Keywords:* oral history, oral history archives, oral memories, interviews, collective memory, oral historymethodology.